

УСЁ ЖЫЦЦЁ — ТЭАТР

ЧЫРВОНКА

ПАЛІВА ДЛЯ СЯБЕ І НА ЭКСПАРТ 12




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

28 САКАВІКА 2024 г. ЧАЦВЕР № 62 (30196)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Валерый МІЦКЕВІЧ, начальнік сакратарыята Усебеларускага народнага сходу:**

*«У склад УНС увойдуць людзі самых розных узростаў і прафесій. У любым грамадскім аб'яднанні: у прафсаюзах, Саюзе жанчын, грамадскім аб'яднанні ветэранаў — прадстаўлены людзі, як мы гаворым, ад малога да вялікага і любой прафесіі: ад рабочага да менеджара. У тым ліку і людзі, якія ўжо не працуюць, знаходзяцца на заслужаным адпачынку. Якраз такі баланс у складзе Усебеларускага народнага сходу дасць магчымасць стабілізаваць пры неабходнасці сітуацыю і прымаць узважаныя, адказныя рашэнні».*

# Скарбонка майстэрства



У салігорскім раённым Цэнтры творчасці дзяцей і моладзі юныя таленты могуць знайсці занятак на любы густ. Напрыклад, школьнікі Міраслаў ЛІПОЎСКІ і Аляксандр АБРАМЧУК займаюцца керамікай у студыі «Скарбонка», якая мае статус заслужанага аматарскага калектыву. Кіруе студыяй Мікалай ПРАТАСЕНЯ, які з задавальненнем перадае сакрэты глінянага майстэрства сваім вучням.

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

## КОРАТКА

- **Рост экспарту прадпрыемстваў «Белдзяржхарчпрама» па выніках першага квартала складзе больш за 20 % у вартасным выражэнні.**
- БУТБ садзейнічае імпарцёрам беларускай сельгаспрадукцыі з краін Азіі.
- **Тавараабарот паміж Беларуссю і Рэспублікай Адыгея за апошнія пяць гадоў вырас у тры разы.**
- У Беларусі ў якасці альтэрнатывы ўзору міжнароднага сертыфіката тэхнічнага агляду будзе прадстаўлены ўзор нацыянальнай дыягнастычнай карты транспартных сродкаў.


ISSN 1990 — 763X


Эксклюзіў

**Рахматула НАЗАРАЎ:**

## «УЗБЕКСКА-БЕЛАРУСКАЕ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ НАПАЎНЯЕЦЦА НОВЫМ ЗМЕСТАМ»



**Наша краіна разглядае Узбекістан як стратэгічнага партнёра ў Цэнтральнай Азіі. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на прыёме даверчых грамат паслоў замежных краін. У найбліжэйшых планах беларуска-ўзбекскага супрацоўніцтва — рэалізацыя новых прарыўных праектаў і развіццё міжрэгіянальных сувязяў. Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што Рахматула Назараў, які папрацаваў у Беларусі і добра ведае нашу краіну (да гэтага ён быў часовым паверaным у справах Рэспублікі Узбекістан у Рэспубліцы Беларусь), будзе максімальна ўцягнуты ў рэалізацыю дамоўленасцяў, дасягнутых на найвышэйшым узроўні, прыменіць усе свае веды і вопыт для ўмацавання двухбаковых сувязяў. Чаму візіт Прэзідэнта Беларусі ва Узбекістан, які адбыўся ў мінулым месяцы, назвалі гістарычным, што прадугледжвае рэалізацыя маштабнай дарожнай карты супрацоўніцтва, як Якуб Колас і Алішэр Наваі сталі сімваламі дружбы двух народаў, у эксклюзіўным інтэрв'ю газеце «Звязда» распавёў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Узбекістана ў Беларусі Рахматула Назараў.**

СТАР. 5

У сезон

## ЧАС КЛОПАТУ САДАВОДАЎ

### Ідзём па саджанцы

**Набліжаецца час пасадкі садоў, і многія садаводы-аматары менавіта цяпер вырашаюць абнавіць «асабістую калекцыю». На якія новыя сарты звыклых пладовых і ягадных культур варта звярнуць увагу? І што з «экзотыкі» прапануюць навукоўцы «дачнікам-наватарам»? З гэтымі пытаннямі мы накіраваліся ў Інстытут пладаводства.**

СТАР. 13



**Ні адзін добрасумленны прадавец не пабаіцца скарыстацца секатарам. Надрэз павінен быць зялёным: гэта паказвае, што саджанец жывы.**